Прачытаў — перадай суседу!

# СЕРАБРАНКА вольная

МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА НЕЗАЛЕЖНАГА ГРАМАДСТВА

№ 3 (7) сакавік 2008



АРТУР ЛАГОДНЫ

Нацыянальная дыктоўка (старонка 2)

Чытацкі конкурс да 90-годдзя БНР (старонка 3)

Як дэмакраты баранілі 8-мы аўтобус (старонка 4)

Эсэ пра Незалежнасць Уладзімера Арлова (старонка 6)

*Успомні краіну, родную маці.*
*Годзе зімовага рабскага сну!*
*Годзе табе ўжо слёзна ўздыхаці,*
*Выйдзі на полі, на сенажаці,*
*Выйдзі стракаці вясну!*

*Я. Колас*

# 25 сакавіка – Дзень Волі

Дэмсілы запрашаюць жыхароў раёна прыняць удзел у святочным шэсці, якое пачнецца ад **пл. Я.Коласа а 18** гадзіне

ПАДВАЛЬЧЫК ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА

Мы рады сустрэцца з Вамі, шаноўны чытач, і прэзентаваць Вам наш чарговы, сакавіцкі нумар.

Прыйшла вясна... Вясна асаблівага года. Сёлета адзначаюцца 90-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), якая была абвешчана ў Мінску вясной 1918 года. 25 сакавіка таго ж года Рада БНР абвясціла незалежнасць нашай краіны. Незалежная дзяржава тады была прызнана шэрагам краін свету.

Няхай жа вясна расцвіце не толькі ў нашых дварах, лецішчах, лясах і палях, але і ў нашых сэрцах! Няхай адчуванне вясны і свабоды заўсёды застаецца разам з намі!

А рэалізацыя волі народа, ягоная свабода немагчымая без незалежнасці. Менавіта апошняя дае народу права на самавызначэнне, выбар уласнага шляху развіцця.

Які наш шлях? Еўропа ці Азія? Мы, народ, павінны самастойна адказаць на гэтае пытанне, а для гэтага мусім пазбавіцца культурнага, эканамічнага ды іншага ціску з боку суседніх дзяржаваў, а таксама сваіх нядобрасумленных начальнікаў, якія забыліся на простых людзей, і развівацца ў накірунку, які найбольш адпавядае нашым гістарычным традыцыям і ментальнасці.

Арганізатары святкавання Дня Волі запрашаюць Вас прыйсці пасля працы ў аўторак, 25 сакавіка, на плошчу Якуба Коласа, каб прайсці мірным шляхам па цэнтральных вуліцах сталіцы, наведаць мясціны, дзе 90 год таму стваралася незалежная Беларусь, ускласці кветкі да помнікаў беларускім паэтам і заспяваць "Магутны Божа" Наталлі Арсенневай.

Не забывайцеся, шаноўны чытач, ліставаць у рэдакцыю (кантакты на апошняй старонцы). Мы будзем вельмі ўдзячныя за тэмы, ідэі, цікавую інфармацыю, якая датычыць Серабранкі і Ленінскага раёна. Напісанне ўласных матэрыялаў вітаецца. Давайце рабіць газету разам!

ДЫКТОЎКА

# Бяры сяброўку – руш... на дыктоўку!

Набліжаецца нашае галоўнае нацыянальнае свята – Дзень абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Сёлета ў шэрагу традыцыйных святочных акцый – адна незвычайная.



МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

Апроч звыклага шэсця і канцэртаў з вечарынамі прапануецца імпрэза, здольная паяднаць людзей рознага веку, мастацкіх густаў, фізічных здольнасцяў і нават палітычных поглядаў. Уся гэтая гаворка – пра дыктоўку! З чым атаясамліваецца ў вас гэнае слова? Слушна, абуджаюцца ўспаміны дзяцінства – школа, парты, настаўніца, напятая цішыня ў класе… Але ж гэтым разам усё будзе інакш. Дзяржаўныя ўстановы не будуць мець да гэтай дзеі ніякага дачынення; усе захады робяцца грамадскасцю пад апекай створанага арганізацыйнага камітэта. Зацверджаны аргкамітэтам тэкст напішам мы ўсе разам – малыя, сталыя і старыя, левыя, цэнтрысты і правыя, журналісты, эканамісты і настаўнікі. Мы – беларусы, якія адчуваюць сваю прыналежнасць да эўрапейскай нацыі і гэтым ганарацца. Такія акцыі ладзяцца ў нашых суседзяў – у Польшчы, Летуве, Францыі для ўзмацнення нацыянальных пачуццяў, згуртавання народа вакол нацыянальных каштоўнасцяў. Мы ўпершыню паспрабуем арганізаваць гэткую імпрэзу на 90-я ўгодкі аднаўлення нашай дзяржаўнасці.

Такім чынам, шаноўныя суродзічы, у нядзелю, 23 сакавіка, раненька прачынайцеся, убірайцеся ды рушце ўсёй радзінай у сядзібу Партыі БНФ, што на вуліцы Машэрава, 8 (былая Варвашэні). Жыхары Серабранкі збіраюцца для напісання дыктоўкі а 12-й гадзіне. Усё будзе адбывацца ўрачыста, у прысутнасці вядомых дзеячаў літаратуры, мастацтва, палітыкі пад камерамі шматлікіх журналістаў. Уласнаручна напісаны тэкст можаце забраць з сабой для захавання ў сямейным архіве або, калі разлічваеце на прыз, здаць у Аргкамітэт на праверку. Процьма станоўчых уражанняў усім удзельнікам гарантуецца!

**СМ**

# Жыхары Серабранкі запрасілі на дыктоўку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў



КАЛАЖ ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

Адпаведныя запрашэнні былі адпраўленыя дэпутатам ПП ад Ленінскага раёна Мінска Генадзю Давыдзьку і Галіне Мазуркевіч.

Грамадскія актывісты Серабранкі выказалі жаданне пабачыць на гэтай святочнай агульнанацыянальнай акцыі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ад Ленінскага раёна.

Адзін з ініцыятараў напісання лістоў Сяргей Мудрачэнка мяркуе, што, калі гэтыя паважаныя асобы сапраўды ёсць народнымі абраннікамі, то яны ў бліжэйшую нядзелю сядуць за пісьмовыя сталы разам з народам. Гэта дасць ім магчымасць у нефармальных гутарках з выбаршчыкамі пахваліцца сваімі дасягненнямі на ніве заканадаўчай дзейнасці, патлумачыць матывы свайго галасавання за скасаванне сацыяльных гарантый і даць адказы на іншыя пытанні неабыякавых грамадзян.

### А калі яны не прыйдуць?

На думку спадара Сяргея, іхная адсутнасць толькі ўмацуе меркаванне значнай часткі серабранцаў, што вышэйпамянёныя спадар і спадарыня напраўду былі абраныя не народам, а ўладнай “вертыкаллю”. Пачакаем…

ГІСТОРЫЯ

# Бенефіс Галубка

З газеты «Савецкая Беларусь» ад 14 красавіка 1923 года: «... Самая мнагалюдная ўскраіна Менску — Серабранка — да гэтых часоў амаль што зусім не прасунулася наперад у культурна-палітычным напрамку.

Ужо больш за год існуе Серабранскі раённы клуб, але толькі існуе, бо той працы, якую ён павінен весці, ён не вядзе. Вядзецца праца выключна тэатральная, дый то не мясцовымі сіламі, а дзякуючы Другой беларускай трупе. Ні дыспутаў, ні лекцыяў клуб не мог наладзіць. І гібее ў цемры раён, шчыльна заселены выключна пралетарскім элементам».

16 чэрвеня 1923 года ў Серабранскім клубе адбыўся бенефіс кіраўніка трупы Уладзіслава Галубка — была пастаўлена яго п'еса, драма ў пяці актах «Блуд». Сюжэт пераносіў гледача ў пачатак XIX стагодцзя: пан-прыгнятальнік гвалтуе сваіх прыгонных сялянак. Процістаіць пану селянін-паўстанец, рэвалюцыянер-самародак, які ў выніку карае нелюдзя-эксплуататара за ўсе злачынствы.




З рэцэнзіі бачна, што «...народу было ў тры разы больш, чым змяшчае будынак клуба, і шмат жадаючых пабачыць п'есу змушаны былі вяртацца назад. Галубка віталі артысты трупы і студэнты Сельскагаспадарчага інстытута. Ад серабранскага жыхарства былі паднесены кветкі».

З 1926 года калектыву У. Галубка была афіцыйна нададзена назва «Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр». Адна са шматлікіх заслуг яго ў тым, што на пачатку 1920-х менавіта гэтыя акцёры ўпершыню пачалі размаўляць з серабранскімі і ляхаўскімі рабочымі па-беларуску.

**Паводле кнігі "Мінск незнаёмы. 1920 – 1940". Аўтар-укладальнік І. Куркоў. Мн., 2002**

ВІКТАРЫНА

# 90 гадоў БНР

1. У якім будынку адбываўся 1-ы Усебеларускі з'езд – прадвеснік БНР?

2. Калі была абвешчаная БНР?

3. Якая ўстанова месціцца цяпер у будынку, дзе была абвешчаная незалежнасць БНР?

4. Як называўся Урад БНР?

5. Дзе нарадзілася цяперашняя Старшыня Рады БНР?

6. Колькі ўсяго было старшыняў Рады БНР?

7. Як імя і прозвішча нашай суайчынніцы, якая пражыла ў БССР некалькі дзесяцігоддзяў, застаючыся грамадзянкай БНР?

Дасылайце свае адказы на пытанні віктарыны на рэдакцыйную пошту **serabranka@tut.by**, альбо тэлефануйце ў рэдакцыю на вэлкамаўскі тэлефон **9625143**.

Імёны пераможцаў будуць надрукаваныя ў наступных нумарах, а іх саміх чакаюць каштоўныя прызы.

**Вядомы беларускі скульптар Алесь Шатэрнік, у майстэрні якога быў зроблены гэты здымак, добра ведае адказ на трэцяе пытанне віктарыны**




АРТУР ЛАГОДНЫ




Маршрут мог быць скасаваны 10 год таму. Цяпер яго абслугоўваюць навюткія МАЗы.

АРТУР ЛАГОДНЫ

# Як дэмакраты 8-мы аўтобус баранілі

Вядома, што зараз цяжка бараніць інтарэсы простага чалавека. Не дапамаглі ў гэтай справе ні прынцып "аднаго вакна", ні шматразовыя сцверджанні ў СМІ кіраўнікоў рознага рангу пра тое, што ўсё робіцца для чалавека. Клопат пра людзей, ініцыяваны "зверху", найчасцей ператвараецца ў дэмагогію. Але калі супольнасці арганізавацца, аб'яднаць свае высілкі, можна дабіцца многага.

Распавядае адзін з ветэранаў дэмакратычнага руху Серабранкі, калісьці актыўны сябра Партыі БНФ спадар Барыс:

Дзесьці ў 1995–1996 гадах Упраўленне транспарту Мінгарвыканкама прыняло рашэнне ліквідаваць аўтобусны маршрут № 8, які праходзіць па вул. Якубава-Пляханава-пр. Ракасоўскага-Кашавога-Партызанскі праспект і ідзе далей да чыгуначнага вакзала. Рашэнне, трэба адразу сказаць, незразумелае, бо гэты маршрут не дублюецца іншымі відамі грамадскага транспарту, акрамя таксі. На паседжанні Свіслацкай рады Партыі БНФ было прынятае рашэнне бараніць інтарэсы нашых жыхароў і распачаць кампанію па сбору подпісаў за аднаўленне маршрута № 8. Актывісты Фронту абышлі некалькі шматкватэрных дамоў па вул. Якубава і хутка сабралі 500 подпісаў. Знайшліся людзі, які не цікавіліся палітыкай, але згадзіліся нам дапамагаць у гэтай справе.

Найперш мы звярнуліся да тагачаснага старшыні Ленінскага райвыканкама сп. Мяца і паведамілі яму пра стаўленне жыхароў мікраёна да адмены аўтобуснага маршрута. Трохі пазней мы напісалі калектыўны ліст у гарвыканкам ад імя Партыі БНФ з патрабаваннем вярнуць восьмы маршрут. Адказ на ліст прыйшоў ад самога мэра Мінска Уладзіміра Ярмошына. Ён распарадзіўся аднавіць працу аўтобуснага маршрута.

Праз некаторы час Упраўленне транспарту зноў вырашыла "аптымізаваць" транспартную сістэму горада за кошт восьмага аўтобуса. Партыя БНФ ды грамадскія актывісты (на гэты раз нам дапамагала 30 добраахвотнікаў) зноў аператыўна сабрала подпісы і распаўсюдзіла ўлётку. У лісце намесніку старшыні гарвыканкама, які курыруе гарадскі транспарт, актывісты прапанавалі прайсці па кватэрах і пацікавіцца меркаваннем жыхароў з нагоды адмены маршрута № 8. Яны таксама папярэдзілі, што калі ўлада не прыслухаецца да голасу народа, штодзень каля гарвыканкама будуць выстаўляцца пікеты з патрабаваннем вярнуць восьмы аўтобус. Ня ведаю, ці далі яны нам веры, але

АСЯРОДАК

праз дзень на маю кватэру патэлефанаваў вышэйузгаданы намеснік і запэўніў, што турбавацца не трэба, восьмы маршрут вяртаецца ў сетку горада.

Сталыя жыхары Серабранкі памятаюць, што калісьці ў суседнім будынку з 23-й паліклінікай месцілася 5-я дзіцячая паліклініка. Пасля таго, як апошняя пераехала ў новы будынак на вул. Пляханава, улады планавалі адкрыць у старым корпусе былой дзіцячай наркалагічную лякарню. Уявіце сабе: побач 4 школы, 23-я паліклініка – ходзяць хворыя людзі, дзеці гуляюць, а паміж імі алкаголікі гойсаюць, якія з’язджаюцца з усяго Мінска! Зноў Партыя БНФ узяла гэтае пытанне пад свой пільны кантроль. Мы сабралі подпісы, накіравалі іх куды трэба (у нас у Партыі ёсць вельмі дасведчаныя юрысты), і гарвыканкам адмовіўся ад сваіх намераў па стварэнні наркалагічнага дыспансера.

Акрамя гэтага актывісты Фронту ўздымалі перад мясцовымі ўладамі пытанні асвятлення дваравой тэрыторыі на рагу вуліц Пляханава-Якубава, забеспячэння жыхароў Серабранкі дабраякаснай пітной вадой, устаноўкі тэлеантэны для 3-х шматкватэрных дамоў на Якубава (у іх прымалася толькі 1 (!) праграма). Пакрысе ўсе праблемы, пра якія мы нагадвалі, мясцовая ўлада мусіла вырашаць.

Я лічу, што не трэба быць абыякавым, замыкацца толькі на сабе. Трэба памятаць, што разам мы – сіла!

**Гутарыла Алена Бурак**




АРТУР ЛАГОДНЫ

# Расклад адпраўлення аўтобуса № 8 з ДС “Серабранка”

| Панядзелак | | Аўторак-пятніца | | Выхадныя | |
|---|---|---|---|---|---|
| 05 | 19 33 47 | 05 | 19 31 42 53 | 05 | 25 42 59 |
| 06 | 01 14 28 42 56 | 06 | 05 16 28 40 51 | 06 | 16 33 47 |
| 07 | 10 24 38 52 | 07 | 02 14 26 38 50 | 07 | 00 14 27 41 55 |
| 08 | 06 20 34 48 | 08 | 01 12 24 36 48 | 08 | 08 22 36 56 |
| 09 | 09 34 57 | 09 | 06 24 44 | 09 | 16 36 56 |
| 10 | 20 43 | 10 | 04 27 50 | 10 | 16 36 56 |
| 11 | 06 29 51 | 11 | 12 29 46 | 11 | 13 31 48 |
| 12 | 14 37 59 | 12 | 03 20 37 54 | 12 | 06 23 41 58 |
| 13 | 22 45 | 13 | 11 28 45 | 13 | 16 34 52 |
| 14 | 08 32 55 | 14 | 02 20 38 55 | 14 | 12 30 47 |
| 15 | 09 23 37 51 | 15 | 07 19 31 43 54 | 15 | 03 18 33 46 |
| 16 | 05 19 33 47 | 16 | 06 17 29 41 53 | 16 | 00 14 28 42 56 |
| 17 | 01 15 29 43 57 | 17 | 04 16 27 39 51 | 17 | 10 24 38 52 |
| 18 | 11 25 40 55 | 18 | 03 14 26 38 50 | 18 | 06 20 38 |
| 19 | 21 46 | 19 | 02 25 50 | 19 | 03 26 50 |
| 20 | 11 36 59 | 20 | 13 30 47 | 20 | 13 37 |
| 21 | 21 44 | 21 | 04 21 38 55 | 21 | 00 23 46 |
| 22 | 06 29 57 | 22 | 15 36 57 | 22 | 10 33 57 |
| 23 | 15 39 | 23 | 20 42 | 23 | 20 43 |
| 00 | 03 | 00 | 03 | 00 | 05 |

**Паводле www.minsktrans.by**

НАПІШЫ ПАЛІТВЯЗНЯМ!

**Праявіце салідарнасць з людзьмі, якія пацярпелі ў барацьбе за свабоду і незалежнасць! Напішыце ім лісты са словамі падтрымкі!** *Вы можаце проста выразаць адрасы ўнізе і наклеіць іх на паштоўкі альбо капэрты.*



**Казулін Аляксандр Уладзіслававіч**
Віцебскі раён, пас. Віцьба, ВК-3, атрад №1
211300
Віцебская вобласць

**Сяргей Парсюкевіч**
вул. Валадарскага, 2, камера 145
220050 Мінск

**Андрэй Кім**
вул. Валадарскага, 2, камера 39
220050 Мінск

АНОНС

## Меркаваныя тэмы на наступны нумар

*Капрамонт. Калі прыйдзе наша чарга?*

*Медыцына. Чаму ў нас стала меней інвалідаў?*

*Мінірынкі Серабранкі. Ці праўда, што іх могуць зачыніць?*

ПРОЗА

**Некалі жыхар Серабранкі, беларускі пісьменнік і гісторык Уладзімер Арлоў у 1990 годзе стварыў эсэ «Незалежнасьць — гэта...». Напісанае да чарговых угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі, эсэ было перакладзенае на дваццаць моваў, сталася амаль легендарным, але дагэтуль ня страціла сваёй актуальнасці. Бліскучы публіцыстычны твор можна знайсці ў кнізе "Сланы Ганібала", выдадзенай у 2005 годзе. Сусветна вядомае эсэ друкуецца на старонках "ВС" з ласкавай згоды аўтара.**

# Незалежнасьць – гэта...*

Уладзімер Арлоў

**Незалежнасьць** – гэта калі ты зьявісься на сьвет у радзільні, дзе няма сама стэрыльных на зямлі прусакоў, затое ёсьць аднаразовыя шпрыцы й пялюшкі.

**Незалежнасьць** – гэта калі твой бацька пойдзе ў ЗАГС, каб атрымаць дакумент, што ты сапраўды нарадзіўся і што цябе назвалі ў гонар дзеда Рыгорам, і кабета, якая сядзіць там, спакойна выпіша яму гэты дакумент, а ня выцягне са стала «Справочник личных имён народов СССР» і ня будзе, размахваючы ім, гістэрычна тлумачыць твайму бацьку, што ён можа без праблем назваць сына Файзулой ці нават Мамаем, а вось Рыгорам – ня можа, бо такога імя проста не існуе ў прыродзе (а существует нормальное человеческое имя Григорий).




АРТУР ЛАГОДНЫ

**Падчас выбараў у беларускі парламент у 2004 годзе над Серабранкай цалкам легальна ўзняўся бел-чырвона-белы сцяг (партыйны)**

**Незалежнасьць** – гэта калі ты пойдзеш у школу і цябе будуць вучыць на тваёй мове (а дзяўчынку Гражынку, якая падабалася табе ў дзіцячым садзе, – на яе мове, а твайго суседа хлопчыка Мішу, тату якога завуць Ісакам, – на ягонай, а другога твайго суседа хлопчыка Алёшу, бацькі якога прыехалі сюды, бо ў іхнім горадзе на Волзе, каб купіць малому малака, трэба займаць чаргу а пятай гадзіне раніцы, – на ягонай). Цябе будуць вучыць на тваёй мове, і дзеля гэтага твым тату й маме ня трэба будзе ўсё лета зьбіраць па кватэрах заявы бацькоў, якія не тое каб не хацелі вучыць сваіх дзетак так, як твае тата й мама, а проста ніколі пра гэта ня думалі, бо вырасьлі пры інтэрнацыяналізьме. І гэтыя заявы не трэба будзе губляць тры разы дырэктару й два – сакратарцы, і першы верасьнёвы дзень ты не пачуеш на ўрачыстай лінейцы, што «год от года хорошеет материально-техническая база нашей школы», а прыйшоўшы ў сваю клясу не даведаесься, што дзякуючы няўхільнаму клопату партыі й ураду, у вас на ўсю клясу толькі адзін лемантар і дзьве «матэматыкі» на роднай мове.

**Незалежнасьць** – гэта калі твая дружына ня будзе змагацца за права насіць імя Паўліка Марозава ці Аляксандра Мясьнікова, бо ўсе вы цудоўна ведаеце, як любіў свайго татку Паўлік і як любіў беларусаў Мясьнікоў.

**Незалежнасьць** – гэта калі ты будзеш студэнтам, і на лекцыі па вышэйшай матэматыцы твой смуглявы раўналетак з Мадагаскару, які вучыцца за грошы сваёй, а не тваёй краіны, нахінецца да цябе і запытае, што значыць слова «імавернасьць», і ты па-француску растлумачыш яму.

**Незалежнасьць** – гэта калі ты будзеш служыць у войску не далей за памежны горад ці вёску твае зямлі, затое табе ніколі не загадаюць фарбаваць траву і прыбіраць тэрыторыю «вот от сюда и до обеда». У нядзелю ты зможаш прыехаць да бацькоў ці да свае дзяўчыны, затое ніхто не назаве цябе «бульбашом», а твайго сябра – «черножопым» за тое, што вы думаеце й гаворыце ў сьне па-свойму, і выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі ня будуць у працэсе гэтай падрыхтоўкі рабіць табе «велосипед», і табе ніколі не загадаюць гастрыць сапёрную рыдлёўку, каб акапацца ў Баку ці ў Тбілісі.

**Незалежнасьць** – гэта калі твая дзяўчына кажа, што хоча на выходныя ў Вену, і ты з чыстым сумленьнем абяцаеш ёй, што ў суботу вы выпʼеце кавы насупраць палацу Шонбрун, і ведаеш, што перад вашай вандроўкаю ніхто не будзе высьвятляць у цябе, ці быў ты ў дзяцінстве жыдом, а таксама, ці быў ты раней за мяжою і калі вярнуўся адтуль, дык зь якой мэтаю.

**Незалежнасьць** – гэта калі на Дзяды, у Дзень памяці продкаў, ты ідзеш на могілкі й ведаеш, што паставіш сьвечку й пакладзеш кветкі, а ня станеш удзельнікам выпрабаваньня балёнчыкаў з нэрвова-паралітычным газам ці новае мадэлі гумовага дручка.

**Незалежнасьць** – гэта калі твой сын прынёс са школы пяцёрку па гісторыі, і ты хваліш яго за гэтую пяцёрку, бо ведаеш, што ён атрымаў яе не па тым прадмеце, дзе вучаць пра Лядовае пабоішча і перамогу калектывізацыі, а па тым, дзе вучаць пра Грунвальдзкую бітву, якая ўратавала твой народ ад сьмерці, і кажуць праўду пра тую ўладу, што расстраляла твойго дзеда й задушыла голадам тваю бабулю.

**Незалежнасьць** – гэта калі да цябе завітае сьпявак зь Ню-Ёрку, і ты вып’еш зь ім добрую чарку вішнёўкі, і пасьля ветлівыя дзяцькі ў цывільным не запрапануюць табе падрабязна напісаць, дзе й што вы пілі й каго пры гэтым лаялі.

Незалежнасьць – гэта калі ты пазбаўлены магчымасьці пачуць, як твой прэзыдэнт вучыць з экрану суайчыньнікаў: «Хто как хаціт, той так і гаварыт», бо твой прэзыдэнт – чалавек пісьменны і хоць адну мову ўсё ж ведае.

**Незалежнасьць** – гэта калі з тэлеперадач і газэт раптам зьнікаюць лісты нястомна-таямнічых вэтэранаў і вусьцішныя паведамленьні пра нацыяналістаў і экстрэмістаў з народных франтоў, якія нават ўначы ня сьпяць, а распальваюць паміж табой, Алёшам і Мішам, тату якога звалі Ісакам, а таксама Гражынаю, якая даўно ўжо твая жонка, міжнацыянальную варожасьць, каб учыніць сярод вас крывавую разьню й пусьціць пад адхон цягнік перабудовы.

**Незалежнасьць** – гэта калі ніхто ня страшыць цябе, што твой народ ня зможа выжыць без вялікага старэйшага брата, бо ня мае сваіх баксітаў ці алмазаў, і ты разумееш, што зусім дарэмна шкадаваў гарапашных галяндцаў ці бэльгійцаў, якія ня маюць ні баксітаў, ні алмазаў, ні нават старэйшага брата.

**Незалежнасьць** – гэта калі велізарныя фуры з надпісам «Центровывоз» (ці бачыў ты хоць раз такія фуры з надпісам «Центроввоз»?) падрулююць не да чужых, а да нашых крамаў.

**Незалежнасьць** – гэта калі раптам высьветліцца, што разумныя людзі ёсьць і ў нас, і калі – крый Божа! – выбухне завод ці прычыніцца якое іншае ліха, ня трэба будзе чакаць, пакуль прыедзе камісія з маскоўскіх разумнікаў.

**Незалежнасьць** – гэта калі на Божай пасьцелі ведаеш, што пасьля таго, як ты памяняеш гэты сьвет на лепшы, на месцы царквы ці касьцёла, дзе цябе хрысьцілі і дзе ты вянчаўся, не выкапаюць сажалку з брудным лебедзем і не пабудуюць басэйн імя XVIII зьезду КПСС, а могілкі, дзе будуць спачываць твае косьці, не зьнясуць і не ператвораць у закіданы пустымі пляшкамі парк культуры й адпачынку імя таварыша Гарбачова або імя таварыша Лігачова.

**Незалежнасьць** – гэта...

**Незалежнасьць** – гэта калі ад нараджэньня да скону пачуваесься сваім чалавекам на сваёй зямлі.

Я веру, што калі-небудзь так будзе.

Бо іначай проста ня варта жыць.

Люты, 1990 г.




АРТУР ЛАГОДНЫ

**На слупах ліхтароў вулічнага асвятлення ў Серабранцы сёння можна убачыць налепкі з запрашэннем прыйсці 25 сакавіка а 18 гадзіне ў цэнтр гораду на плошчу Якуба Коласа, каб прыняць удзел у святочным шэсці. Маршрут шэсця прадугледжвае наведванне памятных мясцінаў Мінска, звязаных з Беларускай Народнай Рэспублікай, якой сёлета спаўняецца 90 год**

СІМВАЛЫ

# 730 гадоў “Пагоні”*

Сёлета, у юбілейны год Беларускай Народнай Рэспублікі (90-я ўгодкі), мы можам адзначаць яшчэ адну дату – 730 гадоў “Пагоні”.

Справа ў тым, што першае ўпамінаньне пра наш дзяржаўны гэрб ў Густыньскім летапісе датуецца 1278 годам. Насамрэч, канечне, гэрб наш нашмат старэйшы.

Лічыцца, што спрадвечны беларускі гэрб – гэна выява аднаго з галоўных дахрысьціянскіх багоў Славянаў – Перуна. Іншыя гісторыкі схіляюцца да думкі, што гэна Ярыла-Сонца, які зьяўляецца альбо адным з увасабленьняў Перуна, альбо ягоным старэйшым сынам. Цікава, што на старажытнай Беларусі нябёснага вершніка звалі Калядой ці Купалам. І толькі значна пазьней яму надаліся рыцарская бронь і тарча з выяваю крыжа (хаця некаторыя гісторыкі лічаць паходжаньне апошняга таксама паганскім – “агонь, што лучыць людзей з багамі”). Хрысьціянізавалася і само імя вершніка. Са Славянскага Ярыла яно трансфармавалася напачатку ў скандынаўска-Варажскае Юрга, а потым ў раньнехрысьціянскае (на тагачаснай Беларусі) Юрай. Цікава яшчэ, што сваім нябёсным патронам Сьв. Юрая абралі ня толькі Ліцьвіны-Беларусы, але й прусы, французы і ангельцы (на Оксфардскім саборы 1222+). Таму першым сьцягам – і гэрбам – у іх стаўся чырвоны крыж на белым полі. У Літве-Беларусі такі сьцяг ужываўся нароўні са спрошчана-гэрбавым бел-чырвона-белым (глядзі, напрыклад, Варшанскую бітву). Але гэна зусім іншая гісторыя, і яна яшчэ будзе.

**Міхал Жук**



**Гэрб гаспадарсьцьва, узяты ў 1252. Кароль Літоўскі і Рускі Міндоўг.**





**Ярыла-Юрай злазіць з каня і забівае зьмея. Гэрбы князя Аляксандра Неўскага “Пагоня” і “Сьв. Юрай”, пад якімі ён вёў беларусоў у бой на Няве і на Чудскім ставу. А вось нябёсны вершнік зь пячаткі караля Літоўскага і Рускага Гедзіміна скача на кані з доўгаю дзідаю ўва ўзьнятай руцэ. Полацкая Пагоня 1330+, як і два вершнікі зь пячатак караля Літоўскага, Рускага і Жамойцкага Вітаўта скачуць на Ўсход. Туды ж кіруе сваю дзіду Сьв. Юрай-зьмеборац.**




АРТУР ЛАГОДНЫ

# Пагоня на нумарах

Калісьці Дзяржаўтаінспекцыя выдавала беларускім аўтааматарам нумары для іх “жалезных коняў” з выявай гістарычнага герба.

Некаторыя здолелі захаваць рарытэты і працягваюць ездзіць з Пагоняй па горадзе, не спяшаючыся замяняць трохі паржавелы нумар на новы. Носьбіты Пагоні схільны лічыць, што гістарычная сімволіка на іх аўто дзейнічае як абярог, бо, па ўласных назіраннях, яны значна радзей трапляюць у ДТЗ у параўнанні з тымі, хто вымушаны ездзіць з адзнакамі савецкай спадчыны.

Мясцовае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне
**“Вольная Серабранка”**
Выдаецца на беларускай мове сучасным правапісам за выняткам матэрыялаў, пазначаных “ * ”. Пазначаныя такім чынам матэрыялы захоўваюць правапіс аўтара.

Выдавец і заснавальнік – супольнасць дэмакратычных актывістаў Ленінскага раёна г. Мінска.
Друкуецца пры падтрымцы ЦВІ г. Мінска.
За змест матэрыялаў адказваюць аўтары па меры магчымасцяў.
Галоўны рэдактар – Артур Лагодны.

**Пры выкарыстанні матэрыялаў і фотаздымкаў “ВС” спасылка абавязковая!**
Капіяванне газеты і распаўсюд сярод сваякоў і знаёмых вітаецца.
Рэдакцыйны інтэрнет-адрас: serabranka@tut.by

Рэдакцыйны тэлефон: (+37529)9625143
**РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА БЯСПЛАТНА**
Наклад 299 экз. (дадатковы 1). Замова № 25.
Падпісана ў друк у 0:31 20.03.2008 г.